Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(21), 2003

*УДК 808.26-54-3*

# Марфалагічнае ўтварэнне ў гідранімii Прыпяцi

Н.А. Багамольнікава

Утварэнне апелятыўнай лексікі даволі падрабязна апісана ў лінгвістычнай літаратуры. Пры гэтым вылучаны чатыры важнейшыя спосабы словаўтварэння з разнавіднасцямі ўнутры асобных: лексіка-семантычны, лексіка-сінтаксічны, марфолага-сінтаксічны і марфалагічны. Спосабы словаўтварэння класіфікуюцца па характару словаўтваральных сродкаў, па іх сувязях з той ці іншай галіной структуры ці ўзроўнем мовы і займаюць рознае месца ў словаўтварэнні з пункту гледжання сінхраніі і дыяхраніі.

Спецыфіка ж анамастычнага словаўтварэння даследавана недастаткова. Падкрэслім, што анамастычныя ўтварэнні ў параўнанні з апелятыўнымі не маюць поўнай аналогіі, выяўляюць свае адметнасці. Так, па-першае, адсутнічаюць тапонімаўтварэнні лексіка-сінтаксічным спосабам. Па-другое, па-іншаму "паводзяць сябе" лексіка-семантычны, марфолага-сінтаксічны і марфалагічны спосабы.

Аб'ектам нашага аналізу з'яўляюцца гідронімы басейна ракі Прыпяць, утвораныя марфалагічным спосабам (пры дапамозе афіксаў). У залежнасці ад таго, які афікс удзельнічае ў словаўтварэнні, выдзяляюць наступныя яго разнавіднасці: прэфіксальнае, суфіксальнае, конфікснае, постфіксальнае, прэфіксальна-суфіксальна-постфіксальнае, прэфіксальна-постфіксальнае, суфіксальна-постфіксальнае, прэфіксальна-нульсуфіксальнае, нульсуфіксальнае ўтварэнні.

У тапонімаўтварэнні марфалагічны спосаб не валодае такімі магчымасцямі, як у апелятыўнай лексіцы. З усіх вышэй адзначаных груп ва ўтварэнні гідронімаў даследуемага арэала займаюць месца суфіксальныя, прэфіксальныя, конфіксныя і нульсуфіксальныя ўтварэнні з рознай ступенню прадуктыўнасці. Акрамя таго, яны маюць і розную часцінамоўную аформленасць (гідронімы-назоўнікі і гідронімы-прыметнікі) і ў структурных адносінах з'яўляюцца аднаслоўнымі.

## Суфіксальныя гідронімы-назоўнікі

Самая шматлікая група з вытворных назваў — суфіксальныя ўтварэнні. Пры класіфікацыі суфіксальных груп тапонімаў па мадэлях некаторыя лінгвісты бяруць пад увагу наяўнасць агульнага суфіксальнага элемента, аднак намі ў першую чаргу ўлічана ступень прадуктыўнасці тапафармантаў.

Мадэль 1(95): іменная аснова (чыстая або ўскладненая іншымі суфіксальнымі элементамі) + тапафармант *-іц-а/-ыц-а: бал.* ***Асав-іц-а, Асіпов-іц-а, Жалезн-іц-а, Зелян-іц-а, Кругл-іц-а, Кубів-іц-а, Лыс-іц-а, Смалав-іц-а;*** *аз.* ***Він-іц-а, Глуш-ыц-а, Орл-іц-а, Святл-іц-а;*** *р.* ***Муцьв-іц-а, Лохн-іц-а;*** *кан.* ***Стуж-ыц-а***. Мадэль прадуктыўная, называе 116 аб`ектаў. Амаль усе гідронімы ўтвораны ад прыметнікаў, адзінкавыя назвы — ад айконімаў (*бал.* Круковіца > *в.* Крукавічы), антрапонімаў (*аз.* ***Дземеніца, Семенніца***) і дзеяслоўных асноў (***Цярэбініца***). У гідранімii фармант *–іц-а-* выконвае субстантывавальную функцыю: **Зеляніца** – зялёная рака, **Глушыца** – рака з глухой плынню, **Святліца** – рака са светлай, празрыстай вадою і г.д. Пры антрапанімічнай аснове гэты суфікс ужыты ў прыналежнай функцыі.

Мадэль 2(92): іменная аснова (чыстая або ўскладненая) + тапафарманты *-ішч-а/-ышч-а, ішч-э: бал.* ***Зімов-ішч-а, Мосц-ішч-а, Рудн-ішч-а, Сел-ішч-а, Уюн-ішч-а, Ям-ішч-э;*** *аз.* ***Ветв-ішч-а, Гумн-ішч-а, Рач-ышч-а, Хмел-ішч-а***. Мадэль прадуктыўная, называе 220 аб`ектаў. Суфікс абазначае месцазнаходжанне аб`екта, на які ўказвае ўтваральная аснова

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф.Скорины

(*гумно, мост, сяло*), характарызуе ўчасткі ці сельскагаспадарчыя ўгоддзі (*глінішча, пажарышча, руднішча, старышча, чашышча, ягадзішча*), сам вадаём, утвораны па тыпу (*азярышча, рачышча, струбішча(сток, роў*). Зрэдку ў гэтай мадэлі сустракаюцца ўтварэнні ад айконімаў (*бал.* ***Гурышча*** >Гурыны), антрапонімаў (***Дзем`янішчэ, Захарышча, Сцепішча***), этнонімаў (***Ляхавішча***), суфікс у іх мае значэнне прыналежнасці.

Мадэль 3(91): іменная або дзеяслоўная аснова + тапафарманты *-аўк-а/-яўк-а, -оўк-а-/-ёўк-а, -еўк-а, -іўк-а*: *бал.* ***Ажын-ёўк-а, Міхайл-аўк-а, Пал-ёўк-а, Прат-оўк-а, Хвашч-оўк-а;*** *аз.* ***Пап-оўк-а, Церн-оўк-а;*** *р.* ***Ціх-аўк-а, Чэпл-іўк-а***. Мадэль прадуктыўная, называе 97 аб`ектаў. Гідронімы ўтвораны пераважна ад асноў агульных назоўнікаў, прыметнікаў, радзей — ад дзеясловаў, антрапонімаў і этнонімаў (*бал.* ***Жыдоўка, Казахоўка;*** *аз.* ***Татараўка, Турчынаўка***), адзінкавыя ўтварэнні ад айконімаў (***Даўлядоўка*** >Даўляды). Суфіксы ў назвах ацэначныя або ўказваюць на блізкае размяшчэнне воднага аб`екта адносна асноўнага.

Мадэль 4(72): іменная аснова + суф. *-ец/-эц* (чысты або ўскладнены) + нулявая флексія: *бал.* ***Азяр-эц, Барав-ец, Кругав-ец, Лыс-ец, Лядз-ец, Макр-эц, Раб-ец, Рудз-ец;*** *аз.* ***Бабін-ец, Гразів-ец***. Мадэль прадуктыўная, называе 84 аб`екты. Гідронімы названай групы ўтвораны ад апелятыўных асноў назоўнікаў і прыметнікаў, ад антрапонімаў — адзінкавыя (*бал.* ***Нікіценец, Турынец***). У гідронімах гэтай групы, матывавальнай базай якіх з'яўляюцца назоўнікі і прыметнікі, суфікс *–ец-/-эц-* выяўляе водны аб'ект паводле характэрнай якасці (формы, стану паверхні, ступені абваднення, месцазнаходжання), у адантрапанімічных – значэнне прыналежнасці.

Мадэль 5(51): іменная аснова + тапафарманты *-ах-а, -ух-а, -ох-а, -іх-а/-ых-а, -ех-а* (апошні рэгіянальны): *бал.* ***Ахрэм-іх-а, Батур-ых-а, Ганчар-ых-а, Коран-іх-а, Лыс-ух-а, Шынгірэ-іх-а;*** *аз.* ***Дам-ах-а, Залат-ух-а;*** *р.* ***Вутв-ох-а, Лапе-ех-а.*** Мадэль прадуктыўная, называе 68 аб`ектаў. У ёй пераважаюць утварэнні ад асноў апелятываў-назоўнікаў і антрапонімаў. Адапелятыўныя гідронімы, аформленыя суфіксамі *-іх-а/-ых-а, -ех-а,* характарызуюць аб`ект па розных прыметах (*бал.* ***Любіха, Кудліха;*** *воз.* ***Вільвіха***), сведчаць аб наяўнасці флоры (***Верасіха***), адантрапанімічныя — указваюць на асоб жаночага полу (значэнне суфікса супадае са значэннем яго ў апелятыўнай лексіцы). Рэдкія аддзеяслоўныя ўтварэнні з такімі суфіксамі характарызуюць аб`ект з боку якасці (*бал.* ***Балбучыха, Хажаіха***). Пры дапамозе суфіксаў *-ах-а, -ух-а* гідронімы ўтвораны толькі ад апелятыўных асноў назоўнікаў і прыметнікаў , іх значэнне якаснае (*бал.* ***Бялуха, Глееваха,*** *воз.* ***Чыстуха***). Суфікс *-ох-а* ўдзельнічае ва ўтварэнні гідроніма ад гідроніма (*р.* ***Вутвоха*** >Вуць).

Мадэль 6(38): іменная, зрэдку дзеяслоўная аснова + фарманты *-н-а/-н-я, -аўн-я, -оўн-я, -оўн-а, -эльн-я:* *бал.* ***Віш-оўн-я, Жоўт-н-я, Пар-н-я, Пiль-н-я, Пуст-эльн-я, Цярэб-н-я;*** *р.* ***Канатоп-н-я, Славеч-н-а;*** *кан.* ***Радоў-н-я; руч. Іл-аўн-я***. Мадэль называе 66 аб`ектаў. Значэнне суфіксаў featureознае. У гідронімах, утвораных ад назоўнікаў, яны ўказваюць на месца вытворчасці чаго-небудзь (*бал.* ***Смалярня, Цагельня***), месцазнаходжанне паблізу жывёльнага свету (***Ваўкаўня, Лісна (Лісня***), паселішча (***Канатопня*** -- каля в. Канатоп), маюць значэнне зборнасці (*бал.* ***Бабоўня, Беразня, Вішоўня, Лешня;*** *аз.* ***Грыбаўня, Лазня, Хвойня;*** *крын.* ***Церамошня***). У апошнім значэнні гэты суфікс "не адзначаны ні ў старажытнай, ні ў сучаснай беларускай мове і яе дыялектах, але ў асноўным канцэнтруецца ў айканіміі на ўсходзе і паўднёвым усходзе Беларусі. [3, с. 110]. У аддзеяслоўных гідронімах суфіксы абазначаюць працэсы, дзеянні ці месцы, дзе адбываліся гэтыя працэсы (*бал.* ***Пільня, Цярэбня;*** *воз.* ***Купальня***). Суфікс *-н-а* зафіксаваны ў гідронімах з непразрыстай семантыкай, што дае падставу сцвярджаць аб узнікненні іх на ранняй стадыі развіцця грамадства (*руч.* ***Самна, Судзельна***).

Мадэль 7(38): іменная, радзей дзеяслоўная аснова + тапафарманты *-анк-а/-янк-а, -онк-а/-ёнк-а, -інк-а/-ынк-а, -енк-а/-энк-а*: *бал.* ***Бераз-інк-а, Гар-энк-а, Лудз-енк-а, Се-янк-а, Хва-ёнк-а, Чарац-янк-а;*** *аз.* ***Машч-анк-а, Пясч-анк-а;*** *р.* ***Серабр-анк-а;*** *кан.* ***Луж-онк-а***. Мадэль называе 44 аб`екты. Пры дапамозе гэтых суфіксаў утварыліся гідронімы жаночага роду ад асноў назоўнікаў і прыметнікаў з ацэначным значэннем: ***Рудзянка*** (колер), ***Пясчанка*** (характарыстыка грунту), ***Даўганка*** (памер), ***Чарацянка*** (раслінны свет), ***Карасцянка***

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

(квалітатыўная назва). Утварэнні ад айконімаў — непрадуктыўныя (*р.* ***Ліхавенка, Нараўлянка, Хабенка;*** *воз.* ***Вяпранка***).

Мадэль 8 (34): іменная, зрэдку дзеяслоўная аснова + суф. *j* + флексія ніякага роду: *бал.* ***Астроўе, Вулічча, Пляссё, Рубчоўе;*** *аз.* ***Бярвічча, Вяліжжа***. Называюцца 37 аб`ектаў. Суфікс мае зборнае значэнне.

Мадэль 9 (34): іменная, зрэдку дзеяслоўная аснова + суф. *-ань, -ень/-энь, -унь, -ынь, -ан, -он/-ён, -ун* + нулявая флексія: *бал.* ***Азер-ун, Беж-ын, Плец-ень, Серабр-он, Скрэб-ень, Узг-унь;*** *аз.* ***Ваг-ан, Лаж-энь, Люб-ень, Хат-ун;*** *р.* ***Др-ынь, Жэл-онь, Рад-унь, Чэрц-ень***. Называюцца 36 аб`ектаў.

Мадэль 10 (31): іменная аснова (чыстая або ўскладненая) + тапафармант *-к-а: р.* ***Вір-к-а, Камен-к-а, Крын-к-а, Стар-к-а;*** *кан.* ***Мядзвед-к-а, Расохат-к-а;*** *руч.* ***Шпон-к-а***. Называецца 31 аб`ект. Гідронімы гэтай мадэлі пераважна адапелятыўнага паходжання, зрэдку ад саміх гідронімаў (*р.* ***Ханка, Прыпятка***) і айконімаў (*р.* ***Мірабелка;*** *крын.* ***Каралінка***). Значэнне суфікса адзначана вышэй.

Мадэль 11 (31): іменная аснова + тапафарманты *-шчын-а, -оўшчын-а, -аўшчын-а*: *бал.* ***Бандар-оўшчын-а, Галь-шчын-а, Раман-оўшчын-а;*** *аз.* ***Паўл-аўшчын-а, Хвядос-аўшчын-а;*** *р.* ***Весёль-шчын-а;*** *крын.* ***Зім-оўшчын-а, Жук-аўшчын-а.*** Мадэль называе 31 аб`ект. Гідронімы ў асноўным аданамастычнага паходжання: назвы ўтвораны ад антрапонімаў (***Раманоўшчына***), айконімаў (*бал.* ***Вароўшчына, Міцькаўшчына***), этнонімаў (***Жыдоўшчына***). Утварэнні ад апелятыўных назоўнікаў і прыметнікаў непрадуктыўныя. Суфіксы ў асноўным маюць значэнне спадчыннай прыналежнасці.

Мадэль 12 (26): іменная аснова, зрэдку дзеяслоўная (часта ўскладненая) + суф. *-ак-/-як, -ік-/-ык-, -нік-, -юк* + нулявая флексія: *бал.* ***Бераз-ак, Ган-юк, Гран-як, Рублен-ік, Трэць-як, Ям-нік;*** *аз.* ***Вір-ак, Жаўн-як, Стар-ак;*** *р.* ***Кругл-ік.*** Называюцца 27 аб`ектаў. Гідранімічныя назвы ўтвораны ад асноў назоўнікаў і прыметнікаў, радзей — ад лічэбнікаў.

Мадэль 13 (13): іменная, радзей дзеяслоўная аснова + тапафарманты *-ч-а, -ш-а, -ж-а: бал.* ***Аста-ч-а, Клім-ч-а, Крыў-ч-а, Свін-ч-а;*** *аз.* ***Куп-ч-а, Лук-ш-а***. Мадэль непрадуктыўная, называе 14 аб`ектаў. Найменні, утвораныя ад антрапонімаў і некаторых апелятываў, нагадваюць усечаныя формы субстантываваных прыналежных ці якасных прыметнікаў (***Клімча – Клімавае, Сцепанча – Сцяпанчыкавае, Свінча*** – свінячае (надта балоцістае). Сярод гідронімаў названай мадэлі вылучаюцца назвы з няяснай семантыкай (*бал.* ***Бунча, Монча (Мунча), Леўмілінча, Сібжа, Сіманша;*** *крын.* ***Занча***). Яны, можна меркаваць, балтыйскага паходжання. Тапанімічныя назвы балтыйскага паходжання з суфіксам *-ч-а* зафіксаваны ў гідраніміі Дняпра і айканіміі [5, с. 134; 3, с. 116].

Мадэль 14 (6): іменная, зрэдку дзеяслоўная аснова + суф. *-аль-, -ель/-эль, -ул-я: бал.* ***Арам-ель, Крыв-аль, Стрыб-ель;*** *аз.* ***Крыв-ель, Крыв-ул-я;*** *р.* ***Жуж-эль***. Мадэль непрадуктыўная, называе 14 аб`ектаў. Суфіксы ўжыты з якасным значэннем.

### Нульсуфіксальныя гідронімы-назоўнікі

Нульсуфіксальныя гідронімы займаюць нязначнае месца ў марфалагічным словаўтварэнні як апелятыўнай, так і тапанімічнай лексікі. У гэтым утварэнні вызначаны наступныя мадэлі:

Мадэль 1 (29): вытворная ўсечаная дзеяслоўная аснова + нулявая флексія: *бал.* ***Ізруб, Непасёл, Оступ, Палом, Падкур, Посеч, Похіль;*** *воз.* ***Перавоз;*** *р.* ***Затоп, Ненач***. Называюцца 29 аб`ектаў. Флексія гідроніма не адпавядае роду апорнага назоўніка.

Мадэль 2 (16): іменная або дзеяслоўная, часта ўсечаная аснова + флексія *-а/-я* (жаночы род), *-о* (ніякі род): *бал.* ***Закот-а, Лош-а, Рэз-а, Страш-а;*** *аз.* ***Прымёт-а, Тур-о;*** *р.* ***Віш-а, Іп-а, Кор-а, Ляск-а, Хан-я (Хан-а);*** *кан.* ***Пярэсек-а, Язд-а***. Называюцца 18 аб`ектаў.

Мадэль 3 (5): аснова прыметніка + нулявая флексія: *бал.* ***Бель, Голь;*** *воз.* ***Невесель***. Мадэль непрадуктыўная, называе 14 аб`ектаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

### Конфіксныя гідронімы-назоўнікі

У параўнанні з суфіксальнымі гідронімамі конфіксныя, як і нульсуфіксальныя, утвараюць нешматлікія групы, хаця ў айканіміі з`яўляюцца выключна папулярнымі [3, с. 122]. Конфіксныя гідронімы характарызуюцца разнастайнасцю, аднак большасць з іх утварае непрадуктыўныя мадэлі.

Мадэль 1 (58): прэфікс за- + корань апелятыва + суф. *j* + флексія *а-,-э: бал.* ***За-балоцц-е, За-броддз-е, За-гацц-е, За-граддз-е, За-лесс-е, За-ніў-е, За-полл-е, За-рэчч-а;*** *аз.* ***За-азер`-е, За-лужж-а.*** Сярод такіх утварэнняў гэта самая прадуктыўная мадэль (называе 77 аб`ектаў). Конфікс указвае на месца гідроніма, які знаходзіцца за чым-небудзь. У межах даследуемага рэгіёна зафіксаваны гідронім ***Забалаць***. Назвы такога тыпу сустракаюцца ў асноўным у заходніх раёнах Беларусі і лічацца ўплывам польскай мовы [3, с. 123].

Мадэль 2 (26): прэфіксы *аб-, між-, на-, над-, па-, пера-, пры-, у-* + аснова апелятыва + суф. *j* + флексія *-е/-э*: *бал.* ***На-балацц-е, Над-хвой-е, Між-балоцц-е, Між-рэчч-а, Пера-броддз-е, Пера-галл-е, Пера-лесс-е, Пры-валл-е, У-балацц-е, У-лесс-е, У-рэчч-а;*** *аз.* ***Па-калл-е, Па-селл-е;*** *ст. русла р.* ***Аб-рэч`е.*** Мадэль называе 28 аб`ектаў. Конфіксы паказваюць знаходжанне гідрааб`екта ў прамежку паміж аднароднымі аб`ектамі (з прэфіксам *пера-*), паміж чым-небудзь (з прэфіксам *між-*), побач з чым-небудзь (з прэфіксамі *пры-, у-*), непасрэдна на самім аб`екце (з прэфіксам *на-*). Гідронімы ***Вузбалоць, Навусць*** (*бал.*); ***Убарць*** (*р.*) аформлены, магчыма, таксама пад уплывам польскай мовы. Разнавіднасць названай мадэлі, адзначаная В. П. Лемцюговай у айканіміі (прэфікс *з-* + уласнае імя + флексія *-е*) , у гідраніміі Гомельшчыны нам не сустрэлася.

Мадэль 3 (16): прэфікс *пад-* + аснова апелятыва + суф. j + флексія *-е/-э*: *бал.* ***Пад-балоцц-е, Пад-ізаб`-е, Пуд-яліч-э;*** *воз.* ***Пад-галл-е;*** *крын.* ***Падгор`-е.*** Конфікс указвае на знаходжанне гідроніма перад чым-небудзь. 19 назваў, аформленых большасцю названых прэфіксаў, але з іншымі суфіксамі, складаюць непрадуктыўны клас.

Конфіксныя найменні па ўтварэнні са шматслоўных назваў, у прыватнасці, з прыназоўнікавых канструкцый.

### Прэфіксальныя гідронімы-назоўнікі

Прэфіксальных утварэнняў гідронімаў у даследуемай мясцовасці захавалася намнога менш, чым суфіксальных. Хутчэй за ўсё ў гідраніміі гэта непрадуктыўны клас (на іншых тэрыторыях даследчыкамі адзначана такая ж з`ява) [1, с. 8].

Мадэль 1 (29): прэфікс *за-* + апелятыў (аснова вытворная або невытворная) у форме адзіночнага ліку ўсіх трох родаў або ў форме множнага ліку: *бал.* ***За-валока, За-горы, За-града, За-гумнішча, За-луг, За-пуць;*** *аз.* ***За-бок, За-быстрыца, За-грунт, За-лозкі, За-каўбаска, За-рачышча***. Называюцца 33 аб`екты. Пры дапамозе прэфікса *за-* ўтвораны назвы-арыенціры, што паказваюць месцазнахожанне гідроніма ў адносінах да іншых аб`ектаў (за чым-небудзь).

Мадэль 2 (26): прэфіксы *па-, пад-* + апелятыў (аснова невытворная або вытворная) у форме адзіночнага ліку ўсіх трох родаў або ў форме множнага ліку: *бал.* ***Пад-гаць, Па-гной, Пад-ігрушка, Пад-ліпкі;*** *воз.* ***Пад-асіна;*** *кан.* ***Пад-грабы***. Мадэль называе 29 аб`ектаў.

18 найменняў з прэфіксамі *між-, на-, неда-, пера-, пры, у-* называюць 22 аб`екты: *бал.* ***Між-балот-а, Між-рэчкі, Неда-колено, На-балот-а;*** *аз.* ***Пера-брод, Пера-вал, У-рало*** (*рала* 'прылада для апрацоўкі зямлі'). Прэфіксы ўтвараюць назвы-арыенціры.

Да другасных вытворных адносяцца і субстантываваныя гідронімы-прыметнікі, утвораныя конфіксным і прэфіксальным спосабамі. У параўнанні з вытворнымі гідронімамі-назоўнікамі яны не адзначаюцца прадуктыўнасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

### Конфіксныя ўтварэнні гідронімаў-прыметнікаў

Мадэль 1 (21): прэфікс + аснова апелятыва + суф. *-н-* + флексія адзіночнага ліку ў адпаведнасці з родам асноўнага назоўніка (формы зрэдку ўсечаныя): *бал.* ***За'-бераж-н-ае, За-глін-н-ае, За-руд-н-а, Між-дарож-н-ае, Пера-лес-н-ае, Пры-борт-н-ае; За-город-н-ае, За-суш-н-ае, Па-двор-н-ае;*** *крын.* ***На-мяж-н-ая.*** Называюцца 21 аб`ект.

Мадэль 2 (14): прэфікс + аснова апелятыва + суф. *-ск-/-цк-* + флексія адпаведна роду апорнага назоўніка (поўная і ўсечаная формы): *бал.* ***Пад-гай-ск-ае;*** *аз.* ***Між-эры-цк-ае, Пад-гор-ск-ае;*** *кан.* ***За-лес-к-ая, Пад-ельніц-к-ая;*** *крын.* ***Пад-бур-ск-а.*** Называюцца 14 аб`ектаў.

### Прэфіксальныя ўтварэнні гідронімаў-прыметнікаў

Мадэль 1 (21): прэфікс + якасны або прыналежны прыметнік, зрэдку лічэбнік у поўнай і ўсечанай форме: *бал.* ***За-пэрвэ (за першае), Пад-гарэлава, Пад-круглае, У-воўчае;*** *аз.* ***За-глыбокае, Пад-арэхава, Пад-воўкава***. Называюцца 21 аб`ект.

Дзве назвы ўяўляюць разнавіднасць гэтай мадэлі (прэфікс + уласнае імя): *воз.* ***За-калоднае*** > *воз.* ***Калоднае, Перад-крэмнае*** > *воз.* ***Крэмнае.***

Адзначаныя афіксы ўтварылі, як і ў папярэдніх групах, назвы-арыенціры.

### Складаныя гідронімы

Як разнавіднасць марфалагічнага словаўтварэння разглядаюць і складанне. У гідронімах гэта група таксама нешматлікая. Пры аналізе складаных назваў перш за ўсё важна ўстанавіць, да якіх часцін мовы адносяцца кампаненты, а затым разгледзець спосабы іх спалучэння.

Па спосабах марфалагічнага выражэння вылучаюцца ў гідраніміі Прыпяці тры групы: складаныя гідронімы назоўнік + назоўнік, назоўнік + дзеяслоў, прыметнік + назоўнік.

Утварэнні па тыпу "назоўнік + назоўнік" (15).

Мадэль 1: назоўнік + назоўнік у Н. склоне (бяссуфіксная: апазітыўны тып): *бал.* ***Бярэзавалока, Комар-Мох, Пчалапасека, Торфбалота, Торфплашчадка;*** *аз.* ***Сімавозера, Цэнцер-венцер***.

Разнавіднасць мадэлі: паміж назоўнікамі ў Н. склоне знаходзіцца злучальная галосная: *бал.* ***Верх-о-смол, Куп-і-берва*** (купіны і бярвенні); *р.* ***Сал-а-куча.***

Мадэль 2: аснова назоўніка + злучальная галосная + аснова назоўніка + суф. + флексія (складана-суфіксальнае ўтварэнне): ***Верб-а-лоз-іц-а, Ніз-а-роў-е*** (j+э). Мадэлі называюць 15 аб`ектаў.

Утварэнні па тыпу "прыметнік + назоўнік" (16).

Мадэль 1: аснова прыметніка, зрэдку лічэбніка + злучальная галосная + аснова назоўніка + суф. + флексія (поўная і ўсечаная формы): *бал.* ***Адн-а-камян-ск-а;*** *аз.* ***Бел-а-воддз-е, Красн-а-сел-л-е, Стар-а-селл-е, Чырвон-а-азер-ск-ае; ст. русла Вялік-а-поль-ск-ае, Стар-а-рэчч-а,*** *р.* ***Свін-а-вод-к-а.***

Мадэль 2: аснова прыметніка + злучальная галосная + назоўнік у Н. склоне: *бал.* ***Астр-ы-карма, Стар-а-пільня;*** *аз.* ***Аўч-ы-хвост, Гніл-а-бок; ст. русла Стар-а-рэчышча*** (атрыбутыўны тып).

Такія гідронімы называюць 20 аб`ектаў.

Утварэнні па тыпу "назоўнік + дзеяслоў" (14)

Мадэль 1: аснова назоўніка + злучальная галосная + аснова дзеяслова + суфікс + флексія: *бал.* ***Сен-а-жа-тк-а;*** *крын.* ***Вад-а-пой-л-а.*** Гідранайменні гэтай мадэлі ўтвораны складана-суфіксальным спосабам.

Мадэль 2: аснова назоўніка + злучальная галосная + аснова дзеяслова + флексія (бяссуфікснае ўтварэнне): *аз.* ***Вад-а-пой, Рыб-а-трас, Свін-а-пас;*** *крын.* ***Вад-а-стой.*** Зрэдку асновы назоўніка і дзеяслова мяняюцца месцамі: *бал.* ***Кін-е-берв-а***.

Установа адукацыі
"Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны"
БІБЛІЯТЭКА
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф.Скорины

Асновы кампанентаў у гэтых мадэлях выкарыстоўваюцца як поўныя, так і ўсечаныя. Адзінкавая назва ўтворана па мадэлі прыслоўе + аснова дзеяслова + суфікс + флексія (*бал.* ***Крут-а-моль-шчын-а***), у 4-ох складаных гідронімах з прычыны "непразрыстай" семантыкі мадэлі ўстанавіць цяжка (*бал.* ***Сімажар;*** *аз.* ***Лажакор, Шчутатоня, Верасож***).

Такім чынам, марфалагічны спосаб ва ўтварэнні онімаў з'яўляецца прадуктыўным, але ў параўнанні з апелятыўнай лексікай абмяжоўвае свае магмымасці толькі некалькімі разнавіднасцямі і рэалізуецца амаль у суфіксальных дэрыватах.

**Умоўныя скарачэнні**

Аз. – азёры, бал. – балота, воз. – возера, кан. – канава, крын. – крыніца, р. – рака, руч. – ручай, ст. русла – старое русла.

о Лічба ў дужках абазначае колькасць утварэнняў дадзенай мадэлі.

**Abstract**

In the article the formation of hydranimics of the river basin Pripyat is studied by a morphological way. It is marked that formations of onomastic names in comparison with appellative names have no full analogy, they reveal their own features.

**Літаратура**

1. Ванагас А. Образование названий рек Литовской ССР. Автореф. диссерт. на соиск. уч. степ. кандидата филол. наук. — Вильнюс, 1966. — 16 с.
2. Земская Е. А. Современный русский язык. Словобразование. Учеб. пособие для студентов по специальности N2101 "Рус. яз. и лит. " — М.: Просвещение, 1973. — 304 с.
3. Лемцюгова В. П. Беларуская айканімія. Лінгвістычны аналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці. — Мн.: Навука і тэхніка. 1970. — 155 с.
4. Подольская Н. В. Типовые восточнославянские топоосновы. Словообразовательный анализ. — М.: Наука, 1983. — 158 с.
5. Топоров В. Н., Трубачев 0. Н. Лингвистический анализ гидронимов Верхнего Поднепровья. — М.: Изд-во АН СССР, 1962. — 270 с.
6. Шакун Л.М. Словаўтварэнне. – Мн.: Вышэйшая школа, 1978. – 127 с.

Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны

Паступіў у друк 01.06.03

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ